(обще)национальных культур и цивилизаций, целых хозяйственно-культурных регионов при происходящей всюду общей интенсификации информационных, технологических процессов и обогащением мировой культуры и цивилизации, Нововозрождением всего человечества – межнационального «кооператива» отечеств.

***Н.У. Савіна,*** *БДЭУ (Мінск)*

## ЭКСКУРСІЙНЫЯ ТЭКСТЫ І ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ТУРЫЗМУ

Выкананне асноўных напрамкаў Нацыянальнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь патрабуе павышэння ўзроўню падрыхтоўкі эканамістаў-менеджэраў у азначанай сферы. У Вышэйшай школе турызму Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта для моладзі створаны ўсе ўмовы, каб авалодаць спецыяльнымі ведамі, якія дазваляюць пазнаваць сябе, навакольную рэчаіснасць, спрыяюць самарэалізацыі асобы. Вучэбны працэс садзейнічае ўваходжанню кожнага студэнта ў сацыяльны і прафесійны свет. На гэта накіравана і спецыяльная дысцыпліна “Экскурсазнаўства” змест і тэхналогія навучання якой асэнсоўваюцца з пункту гледжання развіцця асобы, задавальнення яе патрэб у самаўдасканаленні.

*Пад тэхналогіяй навучання эканамістаў-менеджэраў турызму ў межах курса “Экскурсазнаўства” мы разумеем тэарэтычнае засваенне метадаў і сродкаў падрыхтоўкі экскурсіі і набыцця навыкаў і ўменняў яе практычнай рэалізацыі з улікам прафесійных намераў, інтарэсаў і схільнасцей.* Такі падыход фарміруе індывідуальны стыль вучэбнай дзейнасці, што рэалізуецца праз індывідуальны выбар студэнтам адпаведнай тэмы экскурсіі (курсавой работы). Імкненне навучэнцаў выкарыстаць атрыманыя веды па ўласнай ініцыятыве дае магчымасць вызначыць тэхналогію падрыхтоўкі экскурсаводаў як гуманістычную і творчую. Яе асноўная мэта – выхаванне інтэлектуальнай асобы, развіццё яе творчых і пазнавальных здольнасцей, накіраваных на арганізацыю і рэалізацыю ў працэсе камунікацыі на экскурсіях рознай тэматыкі, што і адпавядае напрамкам развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Беларусі. Асаблівую значнасць у навучальным працэсе набывае ўменне ствараць экскурсійныя тэксты, якія як з’ява духоўнай культуры ўяўляюць сабой адну з форм адлюстравання грамадскай свядомасці, дзе асвойваецца навакольная рэчаіснасць.

Аналіз тэорыі і практыкі стварэння і рэалізацыі экскурсійных тэкстаў абумоўлены, з аднаго боку, прафесійнай дзейнасцю экскурсавода, з другога – лінгвістычнымі асаблівасцямі тэкстаўтварэння. Без навуковай базы, якую ўтварае лінгвістыка, немагчыма высокая якасць тэкстаў, ацэнка тых ці іншых тэкставых феноменаў, у тым ліку апрадмечанага вобраза навакольнай рэчаіснасці. Якаснае стварэнне студэнтамі

эканамічнага профілю экскурсійных тэкстаў і іх інтэрпрэтацыя праз арганізацыю маўленчага ўздзеяння патрабуе інавацыйных тэхналогій навучання, значнае месца сярод якіх займае выкарыстанне ў якасці зрокавага раду экскурсіі відэа- і аўдыяматэрыялаў. Для гэтага на высокім тэхнічным і прафесійным узроўні абсталяваны кабінет турызму факультэта, які дае магчымасць арганізаваць навучальны працэс належным чынам — прымяняць падабраныя паводле вучэбнага плана матэрыялы відэатэкі. Эмацыянальнае ўздзеянне на органы слыху і зроку навучэнцаў павышае эфектыўнасць успрымання і засваення новай інфармацыі, дазваляе мадэляваць рэальныя сітуацыі падбору аб'ектаў паказу і ўвогуле інтэнсіфікуе распрацоўку (па адпаведных прынцыпах) экскурсійных маршрутаў.

Усё большую значнасць пры стварэнні тэкстаў экскурсіі набывае прымяненне сучасных інфармацыйных тэхналогій, у тым ліку глабальнай камп'ютэрнай сеткі Internet. Шматлікія навуковыя дысцыпліны выкарыстоўваюць тэорыю інфармацыі, каб падкрэсліць новы напрамак у функцыянаванні класічных навук (інфармацыйная геаграфія, інфармацыйная эканоміка, інфармацыйнае права). Не складае выключэння у гэтым сэнсе і экскурсазнаўства. Разглядаючы Internet як ансамбль інфармацыі, аб'яднанай у ГІПЕРТЭКСТ, практычна можна знайсці багатую інфармацыю экскурсазнаўчага зместу праз аўтаматызаваныя сістэмы пошуку WAIS- і WWW-. Пры рабоце з WAIS-карыстальніку не трэба траціць шмат часу на пошукі неабходных матэрыялаў, а фармулёўка на спрошчанай англійскай мове ключавых слоў экскурсійнага тэксту робіць гэтую сістэму прыцягальнай для непрафесіяналаў. Аднак спецыфіка ўтварэння тэкстаў экскурсіі патрабуе выкарыстання больш разнастайных сродкаў пошуку інфармацыі, што у сучасны момант забяспечваецца сістэмай WWW-. Стварэнне экскурсійных тэкстаў сутыкаецца з праблемай рассеяння інфармацыі па ансамблю крыніц (закон Брэдфорда ў дачыненні да прыкладной геафізікі, закон Цыпфа ў лінгвістыцы. Гл.: *А.Н. Ефимов.* Информационный взрыв: проблемы реальные и мнимые. М., 1985.С.28). Усведамляючы гэта, стваральнік экскурсійнага тэксту можа паспяхова шукаць патрэбную інфармацыю, выкарыстоўваючы ГІПЕРТЭКСТ. Калі ж у тэксце сустракаецца новае слова ці паняцце, што вельмі распаўсюджана як у кантрольным, так і ў індывідуальным экскурсійных тэкстах (кожную назву, падзею, з'яву, тэрмін, прозвішча і г.д. экскурсавод павінен растлумачыць экскурсантам), то сістэма WWW- дае магчымасць перайсці да пашыранай, больш падрабязнай і поўнай інфармацыі.

Такім чынам, выкладанне *дысцыпліны экскурсазнаўства*, якую можна вызначыць як *інфармацыйнае экскурсазнаўства*, стварэнне экскурсійных тэкстаў у вучэбным працэсе падрыхтоўкі эканамістаў-менеджэраў (экскурсаводаў) на сучасны момант аб'ектыўна звязана з выкарыстаннем сучасных інавацыйных тэхналогій.